# Ружанец перапрашэння
# Беззаганнага Сэрца Марыі
## у рамках НАВЭННЫ з нагоды малітоўнай падрыхтоўкі да прысвячэння Мінска-Магілёўскай мітраполіі Найдаражэйшай Крыві Пана нашага Езуса Хрыста і ўдзячнасці за 35 гадоў аднаўлення структураў Каталіцкага Касцёла ў Беларусі

*Фрагменты Святога Евангелля ў разважаннях пададзены паводле выдання: «Новы Запавет» (Мінск: Про Хрысто, 2017. Разважанні падрыхтаваныя паводле энцыклікі «Ecclesia de Eucharistia» святога Яна Паўла II і іншых дакументаў Каталіцкага Касцёла. Тэкст перапрашэння Беззаганнага Сэрца Марыі, змешчаны пасля разважання кожнай таямніцы, пададзены паводле выдання: «Дзеля трыўмфу Беззаганнага Сэрца Марыі. Набажэнствы ў першыя суботы месяца» (Мінск: Про Хрысто, 2023).*

**Парадак малітвы:**

1. Малітва перад Ружанцам.
2. Выбраная частка Ружанца.
3. Малітва на заканчэнне Ружанца.
4. Малітва прысвячэння Маці Божай.
5. Літанія да Найсвяцейшай Панны Марыі.
6. Разважанне (медытацыя) над таямніцай Ружанца.

Imprimatur
+ Арцыбіскуп Юзаф Станеўскі
Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі
Мінск, № 220/к/25 ад 19 верасня 2025 г.

## Малітва перад Ружанцам

*Молімся:* О Марыя, праз набажэнствы першых суботаў месяца прагнем перапрасіць за пяць відаў знявагаў і абразаў Твайго Беззаганнага Сэрца. Прымі гэтае наша перапрашэнне за блюзнерствы, скіраваныя супраць Твайго Беззаганнага Зачацця, Твайго Дзявоцтва і Твайго Божага Мацярынства. Ахвяруючы Табе гэтае наша перапрашэнне, просім прабачэння для тых, хто не прызнае Цябе за Маці ўсяго чалавецтва і хто сее ў сэрцах дзяцей абыякавасць, ігнараванне і нават нянавісць да Цябе. Урэшце прагнем перапрасіць за знявагі, прычыненыя Табе тымі, хто зневажае Твае святыя выявы.

Маці Божая, аддаем Табе нашыя сэрцы. Ачысці іх, распалі ў іх любоў. Выпрасі нам святло Духа Святога, каб мы маглі пазнаць волю Божую і выканаць яе з Тваёй дапамогаю.

Жадаючы суцешыць і перапрасіць Тваё Беззаганнае Сэрца, распачынаем малітву Святога Ружанца.

## Малітва на заканчэнне Ружанца

Каралева Ружанца Святога, наша Фацімская Пані! Дзякуем Табе за дапамогу, якую Ты нам аказала. Тваё Фацімскае пасланне — гэта праява Мацярынскай любові. Ты прагнеш усіх ўратаваць і кожнага хочаш правесці на Неба.

Хвала і праслаўленне Айцу і Сыну, і Духу Святому за гэтую поўную велічы Каралеву Неба, за Яе Фацімскае пасланне і за выслухоўванне нашых просьбаў. Амэн.

# Малітва прысвячэння Маці Божай

*(чытаецца пасля Ружанца)*

Благаслаўлёная Ты, Марыя, пасланая Богам у Фаціму. Ты прынесла свету пасланне надзеі, заклік да малітвы і пакаяння, а таксама просьбу аб кампенсацыі за грахі, якія чыняць сучасныя людзі.

У той час, калі паволі набліжаецца спаўненне Тваіх словаў аб трыўмфе Твайго Беззаганнага Сэрца, мы звяртаемся да Цябе ў духу любові, пакоры і бязмежнага даверу і, яднаючыся з усім Касцёлам, усклікаем да Цябе: «Тваёй абароне аддаёмся, Святая Багародзіца!».

Сёння стаім перад Табою, наша Маці, Маці нашых сем'яў, Маці людзей і ўсіх народаў. Ты ведаеш усе нашыя цярпенні і надзеі, Ты па-мацярынску адчуваеш усе змаганні паміж дабром і злом, паміж святлом і цемрай, якія ўскалыхваюць наш сучасны свет. Просім, прымі нашыя малітвы, скіраваныя ў Найсвяцейшым Духу да Твайго Сэрца, і атулі Мацярынскай любоўю наш чалавечы свет, які мы даручаем Табе, непакоячыся за зямны і вечны лёс нас саміх і ўсіх нашых братоў і сясцёр.

Ты казала са смуткам: «Шмат душаў ідзе на асуджэнне». Сваёй духоўнай дачцэ, Люцыі, Ты тлумачыла, што «сучасны свет заслугоўвае патопу больш, чым у часы Ноя», а ў сваёй фацімскай таямніцы пакінула нам папярэджанне: сёння свет заслужыў вялікую Божую кару. Толькі Бог можа змяніць ход нашай гісторыі, пакласці канец распаўсюджванню вакол нас цывілізацыі смерці, абудзіць у людзей прагненне будаваць новы, лепшы свет. Як вучні Хрыста, пакліканыя да Яго служэння, стоячы сёння перад Табою, мы прагнем разам з усім Касцёлам з'яднацца перад Тваім Беззаганным Сэрцам у прысвячэнні, з якім Твой Сын у любові да нас аддаў сябе Айцу: «І за іх Я прысвячаю сябе, каб і яны былі асвячоныя ў праўдзе» (Ян 17, 19). Прагнем з'яднацца з нашым Адкупіцелем у гэтым прысвячэнні за свет і за чалавецтва — прысвячэнні, якое ў Яго Боскім Сэрцы мае моц перапрашэння і кампенсацыі за грахі.

Сёння аддаемся Табе безаглядна, каб кожны з нас быў «цалкам Твой», ажно на вякі, каб нішто не адлучыла нас ад Езуса, Збаўцы свету. Няхай нашае прысвячэнне ў еднасці з прысвячэннем Твайго Сына мае моц перамяніць навакольны свет. Няхай яно агорне ўсіх людзей і дапаможа перамагчы ўсялякае зло, якое дух цемры здольны пасяліць у сэрцы чалавека і ў яго ўчынках — тое, якое ўжо распаліў у наш час.

Просім Цябе, Марыя! Пакажы нам сваё Беззаганнае Сэрца — шлях, які вядзе сучасны свет да Бога. Просім, «ад усялякай злой прыгоды выбаўляй нас заўсёды!».

Дапамажы нам моцаю Духа Святога перамагаць усялякі грэх, грэх у кожным яго абліччы: у нас саміх і вакол нас.

Няхай наш дзіцячы давер будзе Тваёю прыладаю, якую Ты выкарыстаеш згодна з Божаю воляю, каб настала цывілізацыя любові, згоды і святасці жыцця — у нас, нашых сем’ях і ўсіх народах.

Няхай у гісторыі свету яшчэ раз аб’явіцца бязмежная магутнасць Адкуплення — магутнасць міласэрнай Любові! Няхай яна спыніць зло! Няхай пераменіць сумленні людзей! Няхай у Тваім Беззаганным Сэрцы для ўсіх адкрыецца святло надзеі!

Найсвяцейшае Сэрца Езуса, прыйдзі Валадарства Тваё праз Беззаганнае Сэрца Марыі. Амэн.

## Літанія да Найсвяцейшай Панны Марыі

*(Ларэтанская)*

Кірые, элейсон, *Хрыстэ, элейсон, Кірые, элейсон,*

Хрыстэ, пачуй нас, *Хрыстэ, выслухай нас.*

Ойча з неба, Божа, – *змілуйся над намі.*

Сыне, Адкупіцель свету, Божа,

Духу Святы, Божа,

Святая Тройца, адзіны Божа, – *змілуйся над намі.*

Святая Марыя, – *маліся за нас.*

Святая Багародзіца,

Святая Панна над паннамі,
Маці Хрыстова,
Маці Касцёла,
Маці ласкі Божай,
Маці міласэрнасці,
Маці надзеі,
Маці прачыстая,
Маці беззаганная,
Маці непарушная,
Маці нявінная,
Маці наймілейшая,
Маці найцудоўнейшая,
Маці добрай рады,
Маці Стварыцеля,
Маці Збавіцеля,
Панна наймудрэйшая,
Панна, хвалы годная,
Панна праслаўлёная,
Панна магутная,
Панна ласкавая,
Панна верная,
Люстра справядлівасці,
Сталіца мудрасці,
Прычына нашай радасці,
Святыня духоўная,
Святыня хвалебная,
Святыня слаўная пабожнасці,
Ружа містычная,
Вежа Давідава,
Вежа з косці слановай,
Залаты доме,
Каўчэг Запавету,

Брама нябесная,

Зорка ранішняя,

Аздараўленне хворых,

Прытулак грэшных,

Палёгка мігрантаў,

Суцяшальніца засмучаных,

Успамога хрысціянаў,

Каралева анёлаў,

Каралева патрыярхаў,

Каралева прарокаў,

Каралева Апосталаў,

Каралева мучанікаў,

Каралева веравызнаўцаў,

Каралева паннаў,

Каралева ўсіх святых,

Каралева, без граху першароднага зачатая,

Каралева ўнебаўзятая,

Каралева Ружанца святога,

Каралева сем'яў,

Каралева супакою,

Каралева Беларусі, – *маліся за нас*.

Баранку Божы, які бярэш на сябе грахі свету, – *даруй нам, Пане.*

Баранку Божы, які бярэш на сябе грахі свету, – *выслухай нас, Пане*.

Баранку Божы, які бярэш на сябе грахі свету, – *змілуйся над намі*.

С.: Маліся за нас, Святая Багародзіца.

Н.: Каб сталіся мы годнымі абяцанняў Хрыстовых.

*Молімся:* Просім Цябе, Пане Божа, дазволь нам, слугам Тваім, цешыцца трывалым здароўем душы і цела, і праз слаўнае заступніцтва Найсвяцейшай заўсёды Панны Марыі май ласку вызваліць нас ад цяперашняга смутку і адарыць вечнай радасцю. Праз Хрыста, Пана нашага.

Н.: Амэн.

## Тваёй абароне

Тваёй абароне аддаёмся, Святая Багародзіца, у нашых патрэбах не пагарджай маленнем нашым. І ад усялякай злой прыгоды выбаўляй нас заўсёды, Панна хвалебная і благаслаўлёная.

О Пані наша, Апякунка наша, Суцяшальніца наша, Ты Заступніца наша, з Сынам сваім нас паяднай, Сыну свайму нас даручай, Сыну свайму нас аддавай.

## Малітва св. Бэрнарда

Памятай, о Найсвяцейшая Панна Марыя, што ніколі не здаралася, каб пакінула таго, хто да Цябе ўцякае, Цябе на дапамогу кліча, Тваёй апекі просіць. Гэтым даверам натхнёны, да Цябе, о Панна над паннамі і Маці наша, імкнуся, да Цябе прыходжу, перад Табою, грэшны, плачучы, стаю. О Маці Слова, не пагарджай словамі маімі, але пачуй іх ласкава і выслухай. Амэн.

## Разважанне (медытацыя) над таямніцай Ружанца

*(на выбар, 15 хвілін)*

## Малітва перад медытацыяй

Маці Найсвяцейшая, Беззаганная Марыя! У першыя суботы месца Ты адкрываеш сваё Беззаганнае Сэрца для ўсіх, хто прагне прыняць у сваё сэрца гэтыя найважнейшыя знакі, якія Бог паказаў нам у Фаціме. Прашу, адкрый перад намі сваё Сэрца. Асмельваемся прасіць аб гэтым з цалкавітай пакорай, а таксама з дзіцячаю адвагаю, таму што хочам наследаваць Цябе у вернасці Богу, таму што хочам жыць любоўю да Твайго Сына, таму што прагнем заўсёды трываць у стане ласкі, і нарэшце, таму, што прагнем ўсё, што толькі можам, ахвяраваць у духу ўміласціўлення за грахі тых людзей, якія зневажаюць і абражаюць Цябе. Дапамажы, каб сэрцы нашыя станавіліся ўсё больш любымі Табе, больш блізкімі Табе, больш падобнымі да Твайго Беззаганнага Сэрца. Амэн.

# Святы Ружанец

**Веру ў Бога,** Айца ўсемагутнага, Стварыцеля неба і зямлі, і ў Езуса Хрыста, Сына Яго адзінага, Пана нашага, які быў зачаты ад Духа Святога, нарадзіўся з Дзевы Марыі, замучаны пры Понцкім Пілаце, укрыжаваны, памёр і быў пахаваны; зышоў да адхлані, на трэці дзень уваскрос з памерлых, узышоў на неба, сядзіць праваруч Бога Айца ўсемагутнага, адтуль прыйдзе судзіць жывых і памерлых. Веру ў Духа Святога, святы Касцёл каталіцкі, еднасць святых, адпушчэнне грахоў, уваскрашэнне цела, жыццё вечнае. Амэн.

**Ойча наш,** каторы ёсць у небе, свяціся імя Тваё, прыйдзі Валадарства Тваё, будзь воля Твая як у небе, так і на зямлі. Хлеба нашага штодзённага дай нам сёння і адпусці нам правіны нашы, як і мы адпускаем вінаватым нашым, і не ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад злога. Амэн.

**Вітай, Марыя,** поўная ласкі, Пан з Табою, благаслаўлёная Ты між жанчынамі і благаслаўлёны плод улоння Твайго, Езус. Святая Марыя, Маці Божая, маліся за нас, грэшных, цяпер і ў хвіліну смерці нашай. Амэн. *(3 разы)*

**Хвала Айцу** і Сыну, і Духу Святому. Як была спрадвеку, цяпер і заўсёды, і на векі вечныя. Амэн.

## Радасныя таямніцы

**І. Звеставанне Найсвяцейшай Панне Марыі.**

З Евангелля паводле св. Лукі

*І сказаў Ёй анёл: «Не бойся, Марыя, бо знайшла Ты ласку ў Пана. Вось зачнеш ва ўлонні сваім і народзіш Сына, і дасі Яму імя Езус». Тады Марыя сказала: «Вось я, слуга Пана. Няхай мне станецца паводле твайго слова» (Лк 1, 30–31. 38).*

Святы Ян Павел ІІ у энцыкліцы *Ecclesia de Eucharistia — Пра Эўхарыстыю ў жыцці Касцёла,* пісаў, што «ў пэўным сэнсе Марыя выказала сваю эўхарыстычную веру яшчэ да таго, як Эўхарыстыя была ўстаноўленая, праз сам факт ахвяравання свайго дзявочага ўлоння, каб магло здзейсніцца Уцелаўленне Божага Слова. Эўхарыстыя, адсылаючы да мукі і ўваскрасення, адначасова сцвярджае непарыўнасць сувязі з таямніцаю Уцелаўлення.

У Звеставанні Марыя зачала Божага Сына таксама ў фізічнай праўдзе цела і крыві, прадбачачы ў сабе тое, што ў пэўнай ступені сакрамэнтальна рэалізуецца ў кожным верніку, які прымае пад постацямі хлеба і віна Цела і Кроў Хрыста» (*Ecclesia de Eucharistia, 55).*

*Маці Божая, Ты вядзеш нас да прыняцця Твайго Сына ў Найсвяцейшым Сакрамэнце, умацуй нашу веру ў рэальную прысутнасць Хрыста, каб кожная сустрэча з Ім перамяняла нашае жыццё.*

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за недахоп веры і паслухмянасці многіх людзей, якія не хочуць слухаць Бога і Яму служыць.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя...* чытаецца просьба: *Захавай і памнож у нас веру ў Тваё Беззаганнае Зачацце.*

*Ойча наш…, Вітай, Марыя… (10 разоў), Хвала Айцу…*

Пасля кожнай таямніцы чытаем:

*Няхай будзе праслаўлёны Найсвяцейшы Сакрамэнт, праўдзівае Цела і Кроў Пана нашага Езуса Хрыста.*

*О мой Езу, прабач нам грахі нашыя, захавай нас ад агню пякельнага, правядзі ўсе душы на неба і дапамажы асабліва тым, каму найбольш патрэбна Твая міласэрнасць.*

*О Марыя, без граху першароднага зачатая, маліся за нас, хто ў Цябе паратунку шукае, і за тых грэшных, хто Табою пагарджае, асабліва за ворагаў Касцёла і даручаных Табе.*

*Найсвяцейшае Сэрца Езуса, прыйдзі Валадарства Тваё праз Беззаганнае Сэрца Марыі.*

**ІІ. Адведзіны Паннай Марыяй святой Альжбеты.**

З Евангелля паводле св. Лукі

*<...> і напоўнілася Альжбета Духам Святым. Яна ўсклікнула моцным голасам і сказала: «Благаслаўлёная Ты між жанчынамі і благаслаўлёны плод улоння Твайго». <...> І сказала Марыя: «Велічае душа мая Пана, і ўзрадаваўся дух мой у Богу, маім Збаўцу» (Лк 1, 41–42. 46–47).*

«І шчаслівая тая, якая паверыла» (Лк 1, 45); Марыя ў таямніцы Уцелаўлення, як зазначаў св. Ян Павел ІІ у энцыкліцы, прысвечанай *Эўхарыстыі,* прадбачыла таксама эўхарыстычную веру Касцёла. Калі, наведваючы Альжбету, Яна носіць у сваім улонні Слова, якое сталася Целам, Марыя ў пэўным сэнсе з’яўляецца «табэрнакулюмам» — першым «табэрнакулюмам» у гісторыі, у якім Сын Божы (яшчэ нябачны для людскіх вачэй) дазваляе Альжбеце адараваць сябе, як бы «выпраменьваючы» сваё святло праз вочы і голас Марыі (*Ecclesia de Eucharistia, 55).*

*Маці Божая, Ты наведваеш нас, прыносячы нам Езуса, заставайся ў прасторы нашага жыцця, узбагачаючы яго ласкамі, каб нашыя сэрцы адкрываліся на дзеянне Духа Святога і разам з Табою славілі Бога.*

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за тое, што так шмат людзей не прызнае Яе заступніцтва перад Богам і не шукае ў Яе дапамогі і апекі.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя...* чытаецца просьба: *Захавай і памнож у нас веру ў Тваё непарушнае Дзявоцтва.*

*Ойча наш…, Вітай, Марыя… (10 разоў), Хвала Айцу…*

**III. Нараджэнне Езуса Хрыста.**

З Евангелля паводле св. Лукі

*«Не бойцеся, я абвяшчаю вам вялікую радасць, якая будзе для ўсяго народу, бо нарадзіўся вам сёння ў горадзе Давіда Збаўца, якім ёсць Хрыстус Пан» (Лк 2, 10–11).*

Зняволенаму і церпячаму народу, які крочыў у цемры, паказалася «святло вялікае». Калі стварэнне свету пачалося ад стварэння святла, то тым больш ззяе бляскам і тое надзвычай вялікае святло, якое дае пачатак новаму стварэнню: ім ёсць сам Бог, які стаў Чалавекам. Вестка аб нараджэнні Божага Сына адначасова суцяшае і ставіць перад чалавецтвам вялікія патрабаванні. Вера дазваляе нам спазнаць чулую любоў Бога і адначасова заахвочвае нас саміх да чыннай любові ў адносінах да Бога і бліжніх *(Ecclesia de Eucharistia, 55).*

*Маці Божая, Ты ў гроце нарадзіла Езуса, Збаўцу свету, але адчувала радасць ад шчырай веры пастухоў і мудрацоў, дапамажы нам заўсёды годна прымаць Езуса, калі Ён прыходзіць да нас у кожнай святой Камуніі.*

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за недахоп веры многіх людзей у Божае Мацярынства і вечнае Дзявоцтва Хрыстовай Маці. Перапрашаем Яе за іх пыху і няўменне пакарыцца таямніцы Нованароджанага.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя...* чытаецца просьба: *Захавай і памнож у нас веру ў Тваю годнасць сапраўднай Божай Маці.*

*Ойча наш…, Вітай, Марыя… (10 разоў), Хвала Айцу…*

**IV. Ахвяраванне Хрыста ў святыні.**

З Евангелля паводле св. Лукі

*І благаславіў іх Сімяон, і сказаў Марыі, Маці Яго: «Вось Гэты прызначаны на падзенне і на паўстанне многіх у Ізраэлі і на знак, якому супраціўляцца будуць. А праз Тваю душу пройдзе меч, каб выявіліся думкі многіх сэрцаў» (гл. Лк 2, 34–35).*

Праз усё сваё жыццё побач з Хрыстом, не толькі на Кальварыі, Марыя рэалізоўвала *ахвярнае вымярэнне Эўхарыстыі*. Калі занесла Дзіця Езуса ў святыню ў Ерузалеме, «каб [Яго] прадставіць Пану» (Лк 2, 22), пачула прадказанне старога Сімяона, што гэтае Дзіця будзе знакам супраціву і што «меч» таксама пройдзе праз Яе душу (пар. Лк 2, 34-35). Такім чынам была прадказана драма ўкрыжавання Сына і ў пэўным сэнсе было прадвешчана *stabat Mater (стаянне Маці)* каля падножжа крыжа. Рыхтуючыся, дзень за днём, да Кальварыі, Марыя перажывае як бы «папярэднюю Эўхарыстыю», можна сказаць, «духоўную Камунію» прагнення і ахвяры, якая будзе мець сваё спаўненне ў паяднанні з Сынам у муцы, а потым — у пасляпасхальны перыяд — выявіцца ў Яе ўдзеле ў справаванай Апосталамі эўхарыстычнай цэлебрацыі — «памяці» мукі (*Ecclesia de Eucharistia, 56).*

*Наша наймілейшая Маці, Ты ахвяравала Езуса Айцу і людзям, навучы нас, нягледзячы на жыццёвыя цяжкасці і выпрабаванні, нястомна ісці Божым шляхам, каб у нашых святынях мы заўсёды знаходзілі Твайго Сына і маглі адчуць радасць ахвяравання свайго жыцця Езусу.*

У гэтай таямніцы перапрашайма Беззаганнае Сэрца Марыі за недахоп у сучасным свеце духу адрачэння і ахвяры.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя...* чытаецца просьба: *Захавай і памнож у нас шанаванне і любоў да Тваіх абразоў.*

*Ойча наш…, Вітай, Марыя… (10 разоў), Хвала Айцу…*

**V. Езуса знаходзяць у Ерузалемскай святыні.**

З Евангелля паводле св. Лукі

*Ён сядзеў сярод настаўнікаў, слухаючы іх і пытаючыся ў іх. <...> І сказала Яму Маці Ягоная: «Дзіця, чаму Ты зрабіў нам так? <...>». Ён сказаў ім: «Чаго ж вы шукалі Мяне? Ці вы не ведалі, што Мне трэба быць у тым, што належыць Айцу Майму?»* (гл. Лк 2, 46. 48. 49)

Сёння таксама здараецца, што хтосьці, пабыўшы з Езусам у цішыні святыні, выходзіць з яе, перамяніўшыся ў новага чалавека. Езус не перастае весці таямнічы дыялог з тымі, хто задае Яму пытанні. Ён, Вязень любові, утоены ў святыні, чакае тых, хто Яго шукае. Ён — адданы Збаўца і Адкупіцель чалавецтва, які нястомна нясе сваю «варту» бязмежнай любові. Разам з Марыяй і Юзафам я шукаю Цябе, Пане Езу, але, магчыма, я сам, па ўласнай віне, пакінуў Цябе на ўскрайку свайго жыцця... Святы Ян Павел II у сваіх лістах нагадвае нам: «Калі мы адаруем Езуса ў Найсвяцейшым Сакрамэнце алтара, Хрыстус набліжаецца да нас і пранікае ў нас глыбей, чым мы самі; праз перамяняючае паяднанне з сабою Ён дае нам удзел у сваім Боскім жыцці, а праз Духа Ён адкрывае нам доступ да Айца, як Ён сам сказаў Філіпу: «Хто бачыў Мяне, бачыў Айца» (Ян 14, 9). Адарацыя Найсвяцейшага Сакрамэнту, якая таксама з'яўляецца прагненнем Камуніі, глыбока яднае нас з Хрыстом і асаблівым чынам яднае тых, хто не можа прыняць Камунію… *(Ян Павел II, з Ліста на 75-ю гадавіну ўрачыстасці Божага Цела)*.

*Найсвяцейшая Маці, якая шукае Езуса, нагадвай нам пра Твайго Сына святлом вечнага зніча перад табэрнакулюмам, калі мы часта забываем пра Яго, нагадвай цішынёю святыні, нагадвай літасцівым позіркам сваіх вачэй і балесным Сэрцам, працятым нашай няўдзячнасцю.*

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за непаслухмянасць Яе Сыну і пагарджанне Яго вучэннем многімі людзьмі. Перапрашаем за тое, што сучасны свет усё больш ахоплены матэрыяльнасцю і ў штодзённым жыцці няма месца для Бога.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя...* чытаецца просьба: *Распалі ва ўсіх сэрцах прагу набажэнства і любоў да Цябе.*

*Ойча наш…, Вітай, Марыя… (10 разоў), Хвала Айцу…*

## Таямніцы святла

**I. Хрост Езуса ў Ярдане.**

З Евангелля паводле св. Мацвея

*Калі Езус ахрысціўся, адразу выйшаў з вады. І вось раскрыліся Яму нябёсы, і ўбачыў Духа Божага, які спускаўся, як голуб, і сыходзіў на Яго. А голас з нябёсаў прамовіў: «Гэта Сын Мой умілаваны, якога Я ўпадабаў» (Мц 3, 16–17).*

Уключэнне ў Хрыста, якое адбываецца ў святым хросце, аднаўляецца і пастаянна ўмацоўваецца праз удзел у эўхарыстычнай Ахвяры, перадусім тады, калі гэты ўдзел поўны дзякуючы ўдзелу ў сакрамэнтальнай Камуніі. Мы можам сказаць, што не толькі кожны з нас прымае Хрыста, але таксама Хрыстус прымае кожнага з нас. Ён умацоўвае повязі сяброўства з намі: «Вы — сябры Мае» (Ян 15, 14). Мы сапраўды жывем дзякуючы Яму: «Той, хто спажывае Мяне, будзе жыць праз Мяне» (Ян 6, 57). У эўхарыстычнай Камуніі ўзнёслым чынам рэалізуецца ўнутранае «пражыванне» Хрыста і вучня: «Заставайцеся ўва Мне, а Я ў вас [буду]» (пар. Ян 15, 4) (*Ecclesia de Eucharistia, 22).*

*Найсвяцейшая Маці, у гэтай таямніцы святла просім Цябе, каб, дзякуючы Богу за сакрамэнт хросту, мы заўсёды прагнулі аднаўлення ў Хрысце праз Эўхарыстыю, а таксама, каб, адаруючы Найсвяцейшы Сакрамэнт, маглі перажываць кожную сустрэчу з Езусам у духу жывой веры.*

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за недахоп веры і паслухмянасці многіх людзей, якія не хочуць слухаць Бога і Яму служыць.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя...* чытаецца просьба: *Захавай і памнож у нас веру ў Тваё Беззаганнае Зачацце.*

*Ойча наш…, Вітай, Марыя… (10 разоў), Хвала Айцу…*

**II. Езус аб’яўляе сябе на вяселлі ў Кане.**

З Евангелля паводле св. Яна

*<...> было вяселле ў Кане Галілейскай. Калі скончылася віно, Маці Езуса сказала Яму: «Не маюць віна». Сказаў ім Езус: «Напоўніце збаны вадою». <...> І кажа ім: «Цяпер чэрпайце і нясіце кіраўніку вяселля». <...> Кіраўнік вяселля пакаштаваў вады, што стала віном (гл. Ян 2, 1. 3. 7–9).*

Калі Эўхарыстыя — таямніца веры, якая пераўзыходзіць наш інтэлект і праз гэта змушае нас да як найбольш поўнай пакоры Божаму Слову, то ніхто ў такой ступені, як Марыя, не можа быць для нас падтрымкаю і правадніком у гэтых адносінах. Наша паўтарэнне справы Хрыста з Апошняй Вячэры, якая з’яўляецца спаўненнем Яго наказу: «Гэта чыніце на Маю памяць!», становіцца адначасова прыняццем запрашэння Марыі быць паслухмянымі Яму без ваганняў: «Тое, што Ён скажа вам, зрабіце» (Ян 2, 5). З матчыным клопатам, засведчаным падчас вяселля ў Кане, Марыя як бы кажа нам: «Не сумнявайцеся, паверце слову майго Сына. Ён, які змог перамяніць ваду ў віно, мае сілу ўчыніць з хлеба і віна сваё Цела і сваю Кроў, ахвяруючы вернікам у гэтай таямніцы жывую памяць сваёй Пасхі, каб такім чынам учыніць з сябе «хлеб жыцця» (*Ecclesia de Eucharistia, 54).*

*Молімся да Маці Божай, каб так, як у Кане Галілейскай, Яна звярталася да свайго Сына ў інтэнцыях усіх сужэнцаў, бацькоў і дзяцей, а яны памяталі пра жыццё ў Божай ласцы.*

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за тое, што так шмат людзей не прызнае Яе заступніцтва перад Богам і не шукае ў Яе дапамогі і апекі.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя...* чытаецца просьба: *Захавай і памнож у нас веру ў Тваё непарушнае Дзявоцтва.*

*Ойча наш…, Вітай, Марыя… (10 разоў), Хвала Айцу…*

**ІІІ. Абвяшчэнне Божага Валадарства і заклік да навяртання.**

З Евангелля паводле св. Марка і св. Лукі

*Пасля таго, як выдалі Яна, прыйшоў Езус у Галілею, прапаведуючы Евангелле Божае і кажучы: «Споўніўся час, і наблізілася Валадарства Божае; кайцеся і верце ў Евангелле (Мк 1, 14–15). Пасля гэтага Ён праходзіў па гарадах і паселішчах, прапаведуючы і абвяшчаючы Добрую Навіну пра Валадарства Божае (Лк 8, 1).*

Чалавек — не пасіўны сведка ўваходу Бога ў гісторыю. Езус заклікае нас дзейсна клапаціцца пра надыход Божага Валадарства і пра Божую справядлівасць. Ён жадае, каб гэта стала нашым асноўным клопатам, таму што чалавек пакліканы да таго, каб рукамі, розумам і сэрцам садзейнічаць пашырэнню Божага Валадарства ў свеце. Асаблівым чынам гэта адносіцца да тых, хто пакліканы да апостальства, але датычыць таксама і кожнага чалавека *(Ecclesia de Eucharistia, 18).*

*О Марыя, Святыня духоўная, наша клапатлівая Маці, Ты ўважліва ўслухоўвалася ў голас Божай Праўды, вучы нас любові да Божага слова і Эўхарыстыі.*

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за грахі людзей, якія не думаюць пра вечнасць і не клапоцяцца пра чысціню сваёй душы і свайго сумлення.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя...* чытаецца просьба: *Захавай і памнож у нас веру ў Тваю годнасць сапраўднай Божай Маці.*

*Ойча наш…, Вітай, Марыя… (10 разоў), Хвала Айцу…*

**IV. Перамяненне Езуса на гары Табор.**

З Евангелля паводле св. Лукі

*<...> ўзяўшы з сабою Пятра, Яна і Якуба, [Езус] ўзышоў на гару памаліцца. Калі маліўся, выгляд твару Ягонага перамяніўся, і адзенне Ягонае стала бліскуча-белым. А з воблака пачуўся голас, які казаў: «Гэта Сын Мой выбраны, Яго слухайце» (гл. Лк 9, 28–29. 35).*

У момант перамянення пачуўся голас Айца Нябеснага: «Гэта Сын Мой умілаваны, Яго слухайце» (Мк 9, 7). Гэтыя словы — праграмныя: мы павінны слухаць Езуса. Ён аб'яўляе нам Айца і паказвае нам, хто мы такія; Ён аб'яўляе чалавека самому чалавеку. Таму не будзем баяцца Хрыста! Узносячы нас да вышыняў свайго Боскага жыцця, Ён не пазбаўляе нас чалавечнасці, а наадварот, надзяляе нас яшчэ большаю чалавечнасцю, надаючы поўны сэнс нашаму асабістаму і грамадскаму жыццю *(Ecclesia de Eucharistia, 20)*.

*Маці Найсвяцейшая, Брама нябесная, навучы нас годна прымаць Езуса ў Эўхарыстыі, каб гэты святы спажытак Цела і Крыві вызваліў нас ад грахоў, дасканала ачысціў ад правінаў, аднавіў і стаў для душы і цела надзейнаю абаронаю ад подступаў злога.*

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за недахоп у сучасным свеце духу адрачэння і ахвяры.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя...* чытаецца просьба: *Захавай і памнож у нас шанаванне і любоў да Тваіх абразоў.*

*Ойча наш…, Вітай, Марыя… (10 разоў), Хвала Айцу…*

**V. Устанаўленне Эўхарыстыі.**

З Евангелля паводле св. Мацвея

*Калі яны елі, Езус узяў хлеб, благаславіў, паламаў і, даўшы вучням, сказаў: «Бярыце і ешце, гэта Цела Маё». І ўзяўшы келіх, і ўзнёсшы падзяку, даў ім, кажучы: «Піце з яго ўсе, бо гэта Кроў Мая новага запавету, якая будзе праліта за многіх дзеля адпушчэння грахоў» (Мц 26, 26–28).*

Эўхарыстыя — вяршыня ўсіх сакрамэнтаў, дзякуючы якім мы дасягаем дасканалай камуніі з Богам Айцом праз Адзінароднага Сына і дзеянне Духа Святога. З усёю яснасцю, што сыходзіла з веры, выказваў гэтую праўду вядомы пісьменнік візантыйскай традыцыі: у Эўхарыстыі, «у адрозненне ад кожнага іншага сакрамэнту, таямніца [камуніі] такая дасканалая, што вядзе да вяршыні ўсялякага багацця: гэта тут знаходзіць сваю мяжу ўсялякае людское жаданне, бо тут мы атрымліваем Бога, і Бог уступае ў дасканалае паяднанне з намі» (так пісаў Нікалас Кабасілас у сваёй кнізе *Жыццё ў Хрысце*). Менавіта таму неабходна развіваць у душы пастаяннае жаданне сакрамэнту Эўхарыстыі. Так узнікла практыка «духоўнай Камуніі», шчасліва ўкаранёная ад вякоў у Касцёле і рэкамендаваная святымі настаўнікамі духоўнага жыцця. Святая Тэрэза ад Езуса пісала: «Калі не прыступаеце да Камуніі і не ўдзельнічаеце ў святой Імшы, то найбольш карысна практыкаваць духоўную Камунію... Дзякуючы ёй вас шчодра пазначае любоў нашага Пана» (*Ecclesia de Eucharistia, 34).*

*Марыя, Маці Эўхарыстыі, учыні, каб нашыя сэрцы заўсёды былі гатовымі годна прыняць Найсвяцейшы Сакрамэнт. Няхай бацькі, дзеці і моладзь ахвотна збіраюцца за эўхарыстычным Сталом.*

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за нягоднае прынясце святой Камуніі і за ўсялякую абыякавасць у адносінах да Езуса, прысутнага ў Найсвяцейшым Сакрамэнце.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя...* чытаецца просьба: *Распалі ва ўсіх сэрцах прагу набажэнства і любоў да Цябе.*

*Ойча наш..., Вітай, Марыя... (10 разоў), Хвала Айцу...*

## Балесныя таямніцы

**I. Малітва Езуса ў садзе Аліўным.**

З Евангелля паводле св. Лукі

*[Езус] адышоў ад іх, укленчыў і маліўся, кажучы: «Ойча, калі Ты жадаеш, адхілі ад Мяне гэты келіх. Але не Мая воля, а Твая няхай станецца». З'явіўся Яму анёл з неба, суцяшаючы Яго. І, моцна пакутуючы, Ён маліўся яшчэ больш. А пот Ягоны быў, быццам кроплі крыві, што падалі на зямлю (гл. Лк 22, 41–44).*

…Устанаўленне Эўхарыстыі сакрамэнтальным чынам папярэджвала падзеі, якія ў хуткім часе павінны былі наступіць, пачынаючы ад канання ў Гетсіманіі. Зноў бачым Пана Езуса, які выходзіць з Вячэрніка, спускаецца з вучнямі ўніз, каб перайсці паток Кедрону і ўвайсці ў Аліўны сад. Хрыстус на малітве перажывае смяротную трывогу, і «пот Ягоны быў, быццам кроплі крыві, што падалі на зямлю» (Лк 22, 44). Распачыналася праліццё Крыві — тае самай Крыві, якую крыху раней Ён ахвяраваў Касцёлу як напой збаўлення ў сакрамэнце Эўхарыстыі; канчаткова яна будзе пралітая на Галгоце і станецца прыладаю нашага Адкуплення (*Ecclesia de Eucharistia*, *3*).

*Маці Божая, Ты на працягу стагоддзяў запальвала сэрцы сваіх дзяцей чуйнай любоўю, адары нас ласкаю глыбокай малітвы перад Тваім Сынам, прысутным у Найсвяцейшым Сакрамэнце.*

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за ўсе грахі і блюзнерствы, якія сталі прычынаю агоніі Хрыста.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя...* чытаецца просьба: *Захавай і памнож у нас веру ў Тваё Беззаганнае Зачацце.*

*Ойча наш…, Вітай, Марыя… (10 разоў), Хвала Айцу…*

**ІІ. Бічаванне Езуса.**

З Евангелля паводле св. Мацвея і св. Яна

*Пілат сказаў ім: «А што мне рабіць з Езусам, якога завуць Хрыстом?» Усе закрычэлі: «Няхай будзе ўкрыжаваны!» <...> І ўвесь народ адказаў: «Кроў Яго на нас і на дзецях нашых» (Мц 27, 22. 25). Тады Пілат узяў Езуса і аддаў на бічаванне (Ян 19, 1).*

Становячыся Чалавекам болю, [Езус] усталяваў новую салідарнасць паміж Богам і цярпеннямі чалавецтва. <...> Ён усё гэта ўчыніў з любові да нас, каб паказаць людзям сваю любоў, каб кампенсаваць за іх грэх і ад раз'яднання прывесці іх да адзінства. Ён усё гэта ўчыніў, бо любоў Хрыста была адлюстраваннем любові Бога да людзей <...>. Перад абліччам гэтай таямніцы можна сказаць, што без цярпення і смерці Хрыста любоў Бога да чалавецтва не адкрылася б ва ўсёй сваёй глыбіні і велічы. А з іншага боку, цярпенне і смерць, дзякуючы Хрысту, сталі заахвочваннем, стымулам, пакліканнем да больш ахвярнай любові *(Ян Павел ІІ, Z katechezy środowej, 19.10.1988 r.)*.

Кроў, пралітая пры бічаванні, — гэта кроў новага запавету, які Бог заключыў з намі. Эўхарыстыя робіць жывой і сапраўднай тую ахвяру, якую Хрыстус здзейсніў. Прымаючы Эўхарыстыю, мы не проста ўспамінаем цярпенні Хрыста — мы рэальна яднаемся з Ім, удзельнічаем у Яго ахвяры і атрымліваем магчымасць прыняць гэтую ахвяру ў сэрца, умацавацца ў веры і жыць па-хрысціянску.

*Маці Збавіцеля, Ты найлепш ведаеш, што ў нашым жыцці найбольш балюча раніць Твайго Сына. Выпрасі для нас ласку верна і пабожна перажываць вялікую таямніцу веры — Эўхарыстыю.*

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за недахоп аскезы, а таксама за распусту і пакланенне целу, так распаўсюджаныя ў сучасным свеце.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя...* чытаецца просьба: *Захавай і памнож у нас веру ў Тваё непарушнае Дзявоцтва.*

*Ойча наш…, Вітай, Марыя… (10 разоў), Хвала Айцу…*

**III. Укаранаванне Езуса цернем.**

З Евангелля паводле св. Мацвея

*А жаўнеры намесніка, завёўшы Езуса ў прэторыю, сабралі каля Яго цэлую кагорту. І, распрануўшы Яго, надзелі на Яго пурпуровы плашч. І, сплёўшы вянок з церняў, усклалі Яму на галаву і далі Яму ў правую руку трысціну. Становячыся перад Ім на калені, насміхаліся з Яго, кажучы: «Вітай, кароль юдэйскі!» І плявалі на Яго, бралі трысціну і білі Яго па галаве (Мц 27, 27–30).*

«Пан Езус у тую ноч, калі быў выданы» (1 Кар 11, 23), устанавіў эўхарыстычную Ахвяру свайго Цела і сваёй Крыві. <...> У ёй — незабыўны запавет мукі і смерці Пана. Эўхарыстыя — гэта не толькі прыбліжэнне тае падзеі, але яе сакрамэнтальнае здзяйсненне. Гэта ахвяра Крыжа, якая жыве на працягу стагоддзяў. Гэтую праўду добра перадаюць словы, якімі ў лацінскім абрадзе вернікі адказваюць на прамоўленую святаром акламацыю: «Гэта вялікая таямніца веры» — «Абвяшчаем смерць Тваю, Пане Езу!».

Касцёл атрымаў Эўхарыстыю ад Хрыста, свайго Пана, не ў якасці аднаго з многіх каштоўных дароў, але як найвялікшы дар, бо гэта дар самога сябе, дар уласнай асобы ў яе святой чалавечнасці, а таксама дар Яго справы збаўлення. (*Ecclesia de Eucharistia*, 11).

*Маці Балесная, Ты і сёння пакутуеш з-за знявагаў Найсвяцейшага Сэрца Твайго Сына і Твайго Беззаганнага Сэрца, прымі гэтыя нашыя малітвы, няхай яны стануць нашым перапрашэннем і ўміласціўленнем.*

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за грахі, якія вынікаюць з крывадушнасці людскіх сэрцаў, што кіруюцца зайздрасцю, хцівасцю ці страхам.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя...* чытаецца просьба: *Захавай і памнож у нас веру ў Тваю годнасць сапраўднай Божай Маці.*

*Ойча наш…, Вітай, Марыя… (10 разоў), Хвала Айцу…*

**IV. Езус нясе крыж на гару Кальварыйскую.**

З Евангелля паводле св. Лукі

*Калі павялі Яго [на ўкрыжаванне], схапілі нейкага Сымона Кірэнэйца, які вяртаўся з поля, і ўсклалі на яго крыж, каб нёс за Езусам. Ішло за Ім вялікае мноства людзей і жанчын, якія плакалі і галасілі па Ім. А Езус абярнуўся да іх і сказаў: «Дочкі ерузалемскія, не плачце па Мне, а плачце па сабе і па дзецях вашых» (Лк 23, 26–28).*

Як уявіць сабе пачуцці Марыі, якая чула з вуснаў Пятра, Яна, Якуба і іншых Апосталаў словы з Апошняй Вячэры: «Гэта Цела Маё, якое за вас будзе выдана» (Лк 22, 19)? Гэта Цела, выдадзенае на ахвяру і зноў узгаданае ў сакрамэнтальных знаках, было тым самым целам, якое зачалося ў Яе ўлонні! Прыняцце Эўхарыстыі павінна было азначаць для Марыі як бы паўторнае прыняцце ў Яе ўлонні сэрца, якое білася ў рытме Яе сэрца паўторным перажываннем таго, што асабіста Яна перажыла пад крыжам (*Ecclesia de Eucharistia, 56).*

*Маці Божая, Ты выхоўваеш нас у духу ахвярнай любові, выпрасі нам ласку заўсёды заставацца вернымі той праўдзе, што, ідучы за Хрыстом, мы павінны адрачыся ад саміх сябе і з пакораю прымаць свой штодзённы крыж.*

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за грахі людзей, якія адкідваюць крыж і ў сваім штодзённым жыцці адносяцца да бліжніх з абыякавасцю ці нават нянавісцю.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя...* чытаецца просьба: *Захавай і памнож у нас шанаванне і любоў да Тваіх абразоў.*

*Ойча наш…, Вітай, Марыя… (10 разоў), Хвала Айцу…*

**V. Укрыжаванне і смерць Езуса.**

З Евангелля паводле св. Лукі

*Калі прыйшлі на месца, званае Чэрап, укрыжавалі там Яго і злачынцаў, аднаго з правага, другога з левага боку. А Езус сказаў: «Ойча, прабач ім, бо не ведаюць, што робяць». <...> Было ўжо каля шостай гадзіны, і цемра настала па ўсёй зямлі аж да гадзіны дзявятай. <...> А Езус закрычаў моцным голасам: «Ойча, у рукі Твае аддаю дух Мой». І, сказаўшы гэта, сканаў (Лк 23, 33–34. 44. 46).*

Эўхарыстыя, дзякуючы сваёй цеснай сувязі з ахвяраю на Галгоце, з'яўляецца ахвяраю ў поўным сэнсе, а не толькі ў сэнсе агульным, як бы толькі гаворка ішла пра звыклы дар Хрыста ў якасці духоўнай спажывы для вернікаў, бо дар Яго любові і Яго паслухмянасці ажно да апошняга ўздыху (пар. Ян 10, 17-18) — гэта перадусім дар для Яго Айца. Зразумела — гэта дар таксама для нас, больш за тое, для ўсяго чалавецтва, але галоўным чынам — гэта дар для Айца, гэта таямніца ахвяры, якую Айцец прыняў, адказваючы ўзаемнасцю на бязмежную адданасць свайго Сына, калі Той стаў паслухмяны ажно да смерці (пар. Флп 2, 8), сваёю Айцоўскаю адданасцю *(Ecclesia de Eucharistia, 13).*

*Маці Божая, Ты стаіш пад крыжам, зраненая цярпеннямі і кананнем свайго Сына, але, нягледзячы на балесны меч у Тваім Сэрцы, застаешся вернай кожнаму чалавеку, які праз смерць Хрыста нарадзіўся для новага жыцця з Богам.*

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за грахі людзей, якія пазбягаюць цярпенняў і крыжа, а шукаюць толькі выгады і задавальнення, адкідваюць дух аскезы, ахвяры і пакаяння.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя...* чытаецца просьба: *Распалі ва ўсіх сэрцах прагу набажэнства і любоў да Цябе.*

*Ойча наш…, Вітай, Марыя… (10 разоў), Хвала Айцу…*

## Хвалебныя таямніцы

**I. Уваскрасенне Хрыста.**

З Евангелля паводле св. Мацвея

*<...> На світанні першага дня тыдня прыйшла Марыя Магдалена і другая Марыя паглядзець магілу. І вось стаўся вялікі землятрус, бо анёл Пана, які сышоў з неба, падышоў, адсунуў камень і сеў на ім. Выгляд жа ягоны быў, як маланка, і адзенне ягонае было белае, як снег. <...> Анёл жа, прамаўляючы да жанчын, сказаў: «Не бойцеся! Ведаю, што вы шукаеце Езуса ўкрыжаванага. Яго тут няма, Ён уваскрос, як сказаў» (Мц 28, 1–3. 5. 6).*

Хрыстова Пасха заключае ў сабе, апроч мукі і смерці Хрыста, таксама Яго змёртвыхпаўстанне. Пра гэта нагадвае акламацыя, якую прамаўляюць вернікі пасля перамянення: *Вызнаем Тваё ўваскрасенне*. Сапраўды, эўхарыстычная Ахвяра здзяйсняе не толькі таямніцу мукі і смерці Збаўцы, але таксама таямніцу Уваскрасення, у якой ахвяра знаходзіць сваё спаўненне. Як жывы і ўваскрослы, Хрыстус можа ўчыніць сябе ў Эўхарыстыі «хлебам жыцця» (Ян 6, 35.48), «хлебам жывым» (Ян 6, 51). Святы Амбрэзій нагадваў пра гэта неафітам, стасуючы падзею змёртвыхпаўстання да іх жыцця: «Калі сёння Хрыстус — твой, то ўваскрасае для цябе кожны дзень» *(Ecclesia de Eucharistia, 14).*

*Маці Уваскрослага Пана, Ты, безумоўна, не раз прымала Хрыста ў Найсвяцейшым Сакрамэнце, дапамажы нам, каб мы, набліжаючыся да стала Пана, усведамлялі жыццядайнасць гэтага дару і сваю адказнасць за годнае яго прыняцце.*

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за грахі людзей, што ігнаруюць святыя сакрамэнты, не выкарыстоўваюць ласкі, здабытыя Хрыстом для чалавецтва праз Яго ўваскрасенне.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя...* чытаецца просьба: *Захавай і памнож у нас веру ў Тваё Беззаганнае Зачацце.*

*Ойча наш…, Вітай, Марыя… (10 разоў), Хвала Айцу…*

**II. Унебаўшэсце Езуса.**

З Евангелля паводле св. Марка

*[Езус] сказаў ім: «Ідзіце па ўсім свеце і абвяшчайце Евангелле ўсякаму стварэнню. Хто паверыць і ахрысціцца, будзе збаўлены, а хто не паверыць, будзе асуджаны». <...> Пасля размовы з імі Пан Езус узнёсся ў неба і сеў праваруч Бога (гл. Мк 16, 15–16. 19).*

Катэхізіс Каталіцкага Касцёла, тлумачачы, якім чынам Касцёл з’яўляецца апостальскім, гэта значыць, закладзеным на фундаменце Апосталаў, указвае на траякае значэнне гэтага выразу. З аднаго боку, быў і застаецца збудаваны на “фундаменце Апосталаў” (пар. Эф 2,20), сведкаў, выбраных і пасланых самім Хрыстом. Апосталы знаходзяцца каля асноваў Эўхарыстыі не ў тым сэнсе, што гэты сакрамэнт паходзіць не ад самога Хрыста, а таму, што быў даверана Езусам Апосталам, а праз іх і іх наступнікаў перададзены нам. Касцёл, цэлебруючы Эўхарыстыю на працягу стагоддзяў, пастаянна захоўвае непарыўнасць дзеяння Апосталаў, паслухмяных наказу Пана *(Ecclesia de Eucharistia, 27).*

Эўхарыстыя «з’яўляецца галоўным і найбольш важным сэнсам сакрамэнту Святарства, які распачаўся ў момант устанаўлення Эўхарыстыі і разам з ёю» *(Ecclesia de Eucharistia, 31).*

*Маці нашай надзеі, якая дасягае вышыняў неба, у Табе мы знаходзім падтрымку ў нашай пілігрымцы на зямлі.*

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за грахі людзей, якія жывуць толькі сённяшнім днём і не думаюць пра вечнасць, спрабуюць стварыць сабе шчасце і рай тут, на зямлі, робячы гэта заўсёды за кошт іншых людзей і ранячы Сэрца любячага Збавіцеля.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя...* чытаецца просьба: *Захавай і памнож у нас веру ў Тваё непарушнае Дзявоцтва.*

*Ойча наш…, Вітай, Марыя… (10 разоў), Хвала Айцу…*

**III. Спасланне Духа Святога.**

Паводле Дзеяў Апосталаў

*Калі настаў дзень Пяцідзясятніцы, усе былі разам у тым самым месцы. Раптам узняўся шум з неба, нібы павеў моцнага ветру, і напоўніў увесь дом, дзе яны сядзелі. З'явіліся ім падзеленыя языкі, быццам ад агня, і затрымаліся на кожным з іх. Усе напоўніліся Духам Святым, і пачалі гаварыць на іншых мовах, як Дух даваў ім прамаўляць (Дз 2, 1–4).*

Калі ў святой Камуніі мы прымаем Цела і Кроў Хрыста, Ён перадае нам таксама свой Святы Дух. Святы Эфрэм піша: «[Езус] назваў хлеб сваім жывым Целам, напоўніў яго самім сабою і сваім Духам. <...> А хто яго з вераю спажывае, спажывае і Агонь Духа. <...> Бярыце і ешце з гэтага ўсе, спажывайце з тым Духа Святога, бо сапраўды — гэта Маё Цела, і хто яго спажывае, будзе жыць вечна». Касцёл просіць гэтага Божага Дару, крыніцы кожнага іншага дару, у эўхарыстычнай эпіклезе. У Рымскім Імшале цэлебрант моліцца: «Учыні, каб мы, узмоцненыя Целам і Крывёю Твайго Сына і напоўненыя Духам Святым, сталіся адным целам і адною душою ў Хрысце». Такім чынам, праз дар свайго Цела і сваёй Крыві Хрыстус памнажае ў нас дар свайго Духа, які выліваецца ўжо ў святым Хросце і ўдзяляецца як «пячатка» ў сакрамэнце Канфірмацыі *(Ecclesia de Eucharistia, 17).*

*Маці Уцелаўлёнага Слова, Абранніца Духа Святога, дапамажы нам не страціць годнасці дзяцей Божых. Няхай моц Божая, якая выплывае з Эўхарыстыі, пранікае ў нашыя сэрцы, пераменяючы нас, і праз нас — моцаю Духа Святога — перамяняе аблічча гэтай зямлі.*

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за грахі людзей, якія грашаць супраць Духа Святога, не прызнаючы Яго існавання і дзеяння. Няхай нашае наследаванне Марыі, якая просіць дароў Духа Святога і якая адданая Яго кіраўніцтву, будзе нашым перапрашэннем за грахі тых, хто кіруецца духам гэтага свету.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя...* чытаецца просьба: *Захавай і памнож у нас веру ў Тваю годнасць сапраўднай Божай Маці.*

*Ойча наш..., Вітай, Марыя... (10 разоў), Хвала Айцу...*

**IV. Унебаўзяцце Найсвяцейшай Панны Марыі.**

З Евангелля паводле св. Лукі

*І сказала Марыя: «Велічае душа мая Пана, і ўзрадаваўся дух мой у Богу, маім Збаўцу, бо глянуў Бог на пакору сваёй слугі. І цяпер благаслаўляць мяне будуць усе пакаленні. Бо вялікае ўчыніў мне Усемагутны, а імя Яго святое» (Лк 1, 46–49).*

У Эўхарыстыі Касцёл цалкам яднаецца з Хрыстом і з Яго ахвяраю, атаясамліваючыся з духам Марыі. Гэта ісціна, якую можна спасцігнуць, зноў прачытваючы «Magnificat» у эўхарыстычнай перспектыве, бо Эўхарыстыя, гэтаксама як гімн Марыі, з’яўляецца перадусім ушанаваннем і падзякаю. Калі Марыя ўсклікае: «Велічае душа мая Пана, і ўзрадаваўся дух мой у Богу, маім Збаўцу», Яна ўжо носіць ва ўлонні Езуса, але праслаўляе Яго таксама «ў» Езусе і «з» Езусам.

Менавіта гэта і ёсць сапраўдная «эўхарыстычная пастава».

Калі «Magnificat» выяўляе духовасць Марыі, то ніўто лепш за гэтую духовасць не дапаможа нам перажываць эўхарыстычную таямніцу. Эўхарыстыя была дадзена нам, каб усё нашае жыццё, гэтаксама як жыццё Марыі, было адзіным «Magnificat» *(Ecclesia de Eucharistia, 58).*

*Маці народа, які пілігрымуе ў вечнасць, просім Цябе за ўсіх тых, хто, набліжаючыся да захаду свайго жыцця, зведвае вялікі страх, каб яны маглі атрымаць ласку прыняцця святога Віятыка.*

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за грахі людзей, якія не прымаюць дагмату пра ўнебаўзяцце Марыі.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя...* чытаецца просьба: *Захавай і памнож у нас шанаванне і любоў да Тваіх абразоў.*

*Ойча наш…, Вітай, Марыя… (10 разоў), Хвала Айцу…*

**V. Укаранаванне Найсвяцейшай Панны Марыі.**

З Апакаліпсіса св. Яна

*Вялікі знак з’явіўся на небе: жанчына, апранутая ў сонца, і месяц пад яе нагамі, а над яе галавою вянок з дванаццаці зорак (Ап 12, 1).*

Увойдзем, умілаваныя браты і сёстры, у школу святых, вялікіх настаўнікаў сапраўднай эўхарыстычнай пабожнасці. У іх сведчанні тэалогія Эўхарыстыі набывае ўвесь бляск перажывання, «заражае» нас і як бы «запальвае». Паслухайма найперш Найсвяцейшую Дзеву Марыю, у якой таямніца Эўхарыстыі аб’яўляецца больш, чым у кім бы то ні было іншым, як таямніца святла. Гледзячы на Яе, спазнаем перамяняльную сілу, якой валодае Эўхарыстыя. У Ёй мы заўважаем свет, адноўлены ў любові. Сузіраючы Яе, узятую ў Неба з душою і целам, заўважаем краёчак «новых нябёсаў» і «новай зямлі», якія адкрыюцца перад нашымі вачыма разам з паўторным прыйсцем Хрыста. Тут, на зямлі, Эўхарыстыя з’яўляецца іх «абяцаннем» і, у пэўным сэнсе, апярэджаннем: *Veni, Domine Jesu! (Ecclesia de Eucharistia, 62).*

*Каралева неба і зямлі, давяраемся Тваёй Мацярынскай апецы. Прагнем ахвяраваць Табе душу і цела, розум, волю і пачуцці, каб Ты магла прывесці нас да Твайго Сына ў небе.*

У гэтай таямніцы будзем перапрашаць Беззаганнае Сэрца Марыі за грахі людзей, якія не прызнаюць каралеўскай годнасці Найсвяцейшай Маці і не аддаюць Ёй належнай пашаны.

Пасля кожнай малітвы *Вітай, Марыя...* чытаецца просьба: Распалі ва ўсіх сэрцах прагу набажэнства і любоў да Цябе.

*Ойча наш…, Вітай, Марыя…(10 разоў), Хвала Айцу…*